**ВОЛЬГА ЛАБАЧЭЎСКАЯ, НАДЗЕЯ САЎЧАНКА.**

**Аб фатаграфічнай спадчыне І. А. Сербава: зборы ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта і Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь.**

Фотаэтнаграфічная спадчына Ісака Сербава (1871-1943) ўяўляе вялікую каштоўнасць для вывучэння традыцыйнай культуры Беларусі. Яе значэнне для вывучэння этнаграфіі, народнага касцюма, архітэктуры цяжка перааацаніць. Яго фотаздымкі займаюць выключнае месца ў гісторыі беларускай этнаграфічнай фатаграфіі.

Вядомы два вялікіх зборы этнаграфічных фотаздымкаў І. Сербава. У аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта ў фондзе F-46 захоўваецца 450 фотаздымкаў з Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мазырскага, Пінскага, Рэчыцкага, Слуцкага паветаў Мінскай губерні. Гэта ў большасці невялікія па памерах фотаздымкі (6х9 см), наклееныя на кар дон з уласнаручнымі подпісамі І. Сербава. На іхпазначаны месца (вёска, павет), імя, прозвішча,узрост, полаўзроставы стан (дзевіца, бабухна і інш.), прыналежнасць да пэўнай трупы насельніцтва (напрыклад, выбранцы, сакуны), рост у аршынах і вяршках тых, хто на іх сфатаграфаваны. Часткова подпісы зроблены на беларускай мове (назвы вёсак) або на мясцовай гаворцы. Калекцыю фотаздымкаў І. Сербава мае таксама Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Некаторая іх частка не анатавана, болыпасць мае пазначэнне толькі населенага пункта.

На вялікі жаль, рэпрадукцыі фотаздымкаў этнографа з абодвух збораў разышліся па старонках этнаграфічных выданняў і музейных экспазіцыях, згубіўшы пры гэтым аўтарства і каштоўную інфармацыю аб тым, хто на іх зафіксаваны, у якой мясцовасці яны былі зроблены.

Намі былі вывучаны абедзве калекцыі, праведзены іх параўнальны аналіз. Найбольш поўным з'яўляецца віленскі збор. Яго фарміраванне звязана з перыядам дзейнасці Паўночна- заходняга аддзела Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства (ІРГТ), актыўным сябрам якога быў І. Сербаў. У 1911-1913 гг. на сродкі Таварыства этнограф наладзіў тры навуковых экспедыцыі, пераважнаў раёны Палесся. Справаздачы па паездках былі надрукаваны ў «Записках Северо-Западного отдела ИРГО» [1; 2; 3]. Частка дакументаў па арганізацыі гэтых экспедыцый захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Віленскага універсітэта ў фондзе 34.

Мэтай экспедыцый было фатаграфаванне народнага побыта, этнаграфічных рэалій, якія імкліва ў той час знікалі. Не выпадкова экспедыцыі іх называлі «этнаграфічна-фатаграфічныя экскурсіі», «фатаграфічныя экспедыцыі». Зробленыя падчас гэтых паездак фотаздымкі І. Сербаў перадаў Паўночна-заходняму аддзелу ІРГТ ў Вільні, якое планавала выдаць іх асобным альбомам. Аднак ў сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны і прыпыненнем дзейнасці гэтай арганізацыі, план выдання альбома не быў ажыццёўлены. Аб віленскай калекцыі на Беларусі забыліся на доўгія гады, а ў Вільні яна згубіла імя аўтара фотаздымкаў. Нагадалі пра іх публікацыі І. К. Цішчанкі, якія былі прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння І. А. Сербава [4; 5].

Намі была вывучана віленская калекцыя і архіўныя дакументы, якія тычацца сербаўскіх экспедыцый 1911-1913 гг. У выніку былі падрыхтаваны публікацыі аб фотаэтнаграфічнай спадчыне І. Сербава [6; 7]. Быў складзены таксама геаграфічны паказальнік віленскай калекцыі. Этнограф рабіў фотаздымкі ў 72 населеных пунктах Мінскай губерні ў Пінскім, Ігуменскім, Слуцкім, Бабруйскім, Мазырскім, Рэчыцкім паветах. У паказальнікі яны суаднесены з сучасным адміністрацыйным падзелам Беларусі. Геаграфія здымкаў ахоплівае значную тэрыторыю сучасных Мінскай (Старадарожскі, Слуцкі, Барысаўскі, Уздзенскі, Нясвіжскі, Капыльскі раёны), Брэсцкай (Пінскі, Столінскі, Лунінецкі, Івацэвіцкі, Ганцавіцкі, Ляхавіцкі раёны) Магілёўскай (Асіповіцкі раён), Гомельскай (Жлобінскі, Светлагорскі, Калінкавіцкі, Мазырскі, Петрыкаўскі, Жыткавіцкі, Рэчыцкі, Рагачоўскі, Хойніцкі раёны) абласцей. У адпаведнасці з гісторыка-этнаграфічным падзелам Беларусі, фотаздымкі паходзяць з Заходняга і Усходняга Палесся, а таксама паўднёва-ўсходняй часткі

Цэнтральнай Беларусі. Восем населеных пунктаў цяпер знаходзяцца на тэрыторыі Украіны. Ёсць фотаздымкі гарадоў Пінска і Мінска.

У выніку сумеснай працы з аддзелам рукапісаў Бібліятэкі Віленскага універсітэта на сайце гэтай ўстановы (у раздзеле «электронныя каталогі» / аддзел рукапісаў) размешчаны электронны каталог калекцыі фатаграфій

І. Сербава з поўным апісаннем усіх адзінак захавання [8]. Тут прыведзены поўныя тэксты аўтарскіх подпісаў да фотаздымкаў і пазначана назва месца, раёна, вобласці (на рус. мове) згодна сучаснаму адміністрацыйнаму падзелу Беларусі і Украіны.

Вывучэнне віленскай калекцыі і публікацыя яе электроннага каталогу дазваляе праанілізаваць і ацаніць мінскі збор фотаздымкаў І. Сербава. У мінскім зборы часткова дубліруюцца фотаздымкі з ганчарнай Гарадной, выявы сялян - «выбранцаў» з в. Лучнікі каля Слуцка, выява аратая з в. Юравічы. У адзінкавых экземплярах ёсць тут і фотаздымкі з іншых населеных пунктаў. Разам з тым, у мінскім зборы маюцца здымкі, якія адсутнічаюць ў Вільні. Напрыклад, некалькі фота з в.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кульшчычы (Слаўгарадскі р-н), дзе нарадзіўся І. Сербаў. У віленскай калекцыі адтуль ёсць толькі адзін фотаздымак.

Параўнанне абодвух фотакалекцый дазваляе атрыбутаваць фотаздымкі І. Сербава ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі, якія не маюць аўтарскіх подпісаў. Гэта дазваляе вярнуць унікальным фотадакументам іх сапраўдную гістарычную каштоўнасць, пашырае крыніцазнаўчую базу этнаграфічных і краязнаўчых даследаванняў, а таксама стварае падставу больш шырокага выкарыстання гэтых дакументаў ў практыцы музейнай рэпрэзентацыі традыцыйнай культуры беларусаў.

**Крыніцы:**


1. Сербов, И.А. Белорусы - сакуны / И.А. Сербов. - Пг., 1915 - XVII. - 180 с. (Сборник отд. рус. языка и словесности Императ. Акад. наук).
2. Сербов, И.А. По Дреговичской бласти летом 1911 года / И.А. Сербов // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 3. - Вильна, 1912. - С. 304-320.
3. Сербов, И.А. Поездка по Полесью летом 1912 года / И.А. Сербов // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. Кн. 4. - Вильна, 1914. - С. 70-102.
4. Цішчанка, І. К. Акрылены Палессем (125 гадоў з дня нараджэння І. А. Сербава) / І.К. Цішчанка// Мастацтва. - 1996. - № 7. - С. 65-73.
5. Цішчанка, І.К. З творчай спадчыны І. А. Сербава / І.К. Цішчанка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. - 1974. - № 1. - С. 46-51.
6. Лобачевская, О.А. Коллекция фотографий белорусского этнографа Исаака Сербова в собрании отдела рукописей Вильнюсского университета: к вопросу аб истории создания, атрибуции и датировке / О.А. Лобачевская // Vilniaus Universiteto Bibliotekos metrastis 2010. Vilnus: Vilniaus Universiteto leidykla, 2010. - S. 90 - 121.
7. Лабачэўская, В. «Мабыць, я вельмі захапляюся Палессем...» Пра этнаграфічную спадчыну этнографа Ісака Сербава / А. Лабачэўская // ARCHE. - 2011. - № 3. - С. 28-51.
8. Библиотека Вильнюсского университета. - [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.mb.vu.lt. - Дата доступа: 19.09.2011.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ